DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ПАСТАНОВА № 21 ад 21.05.07
г. Мінск

Аб зацвярджэнні Інструкцый па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны

У адпаведнасці з абзацам трэцім артыкула 9 Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь” Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Зацвердзіць прыкладзеныя:

Інструкцыю аб складзе, парадку распрацоўкі і ўзгаднення навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях;

Інструкцыю аб складзе, парадку распрацоўкі і зацвярджэння праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей;

Інструкцыю аб парадку прызначэння навуковага кіраўніка пры выкананні работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці, яго правы і абавязкі.

Міністр У.Ф.Матвейчук

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

ЗАЦВЕРДЖАНА
пастанова Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
“21” мая 2007 г. № 21

# ІНСТРУКЦЫЯ
## аб складзе, парадку распрацоўкі і ўзгаднення навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная Інструкцыя рэгламентуе склад, парадак распрацоўкі і ўзгаднення навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях (далей – навукова-праектная дакументацыя) і накіравана на выкананне патрабаванняў Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь” (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., № 9, 2/1195).

2. Дадзеная Інструкцыя абавязковая для выканання ўсімі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі (заказчыкі і праектыроўшчыкі), якія зацікаўлены ў распрацоўцы навукова-праектнай дакументацыі.

3. Пад навукова-праектнай дакументацыяй у дадзенай Інструкцыі разумеецца камплект дакументаў і матэрыялаў, які падрыхтаваны (распрацаваны) пры выкананні навукова-даследчых і праектных работ на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях (далей- гісторыка-культурная каштоўнасць).

## ГЛАВА 2
## СКЛАД НАВУКОВА-ПРАЕКТНАЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ

4. Навукова-праектная дакументацыя распрацоўваецца пры выкананні работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях па рэстаўрацыі, кансервацыі, аднаўленню, рамонту, прыстасаванню, рэканструкцыі, дапаўненню, раскрыццю па асобку або ў спалучэнні некалькіх азначаных відаў (далей - рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы).

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Навукова-праектная дакументацыя рыхтуецца для прынняцця праектных рашэнняў на правядзенне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на падставе навуковага абгрунтавання, якое рыхтуецца па выніках праведзеных археалагічных, архіўна-бібліяграфічных і натурных даследаванняў у мэтах высвятлення і ўдакладнення адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей гісторыка-культурнай каштоўнасці і прыняцця мер па іх захаванню.

Склад і змест раздзелаў навукова-праектнай дакументацыі вызначаецца ў залежнасці ад віда рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ. Аб'ём навукова-праектнай дакументацыі павінен быць дастатковым для падрыхтоўкі навуковага абгрунтавання прымаемага праектнага рашэння і выканання запланаваных рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ.

5. Навукова-праектная дакументацыя павінна змяшчаць наступныя раздзелы:

папярэднія работы;

комплексныя навуковыя даследаванні;

праектная дакументацыя;

каштарысная дакументацыя;

навукова-рэстаўрацыйная справаздача.

6. Раздзел “Папярэднія работы” выконваецца з мэтай азнаямлення з гісторыка-культурнай каштоўнасцю, вызначэння характару і аб'ёму неабходных работ, якія забяспечваюць найбольш поўнае навуковае абгрунтаванае выяўленне адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей гісторыка-культурнай каштоўнасці. На падставе раздзела “Папярэднія работы” прымаюцца рашэнні аб неабходнасці выканання першачарговых супрацьаварыйных работ і вызначаюцца накірункі навукова-даследчых работ.

Папярэднія работы павінны ўключаць:

схематычныя абмеры гісторыка-культурнай каштоўнасці (без перадачы чарцяжоў заказчыку);

вызначэнне фізічнага аб'ёму гісторыка-культурнай каштоўнасці – габарыты (на ўзроўні зямлі) па шырыні, даўжыні, вышыні да карніза або да максімальна высокай часткі будынка (вільчака, вежа, барабан, купал, інш.);

фотафіксацыю – фотаздымкі ў колькасці дастатковай для візуальнага прадстаўлення гісторыка-культурнай каштоўнасці, яе адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей, магчымых пашкоджанняў і страт;

акт тэхнічнага стану гісторыка-культурнай каштоўнасці, складзены ў адпаведнасці з дадаткам 2 да дадзенай Інструкцыі;

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

кароткія гісторыка-бібліяграфічныя звесткі – даты стварэння і пераробак гісторыка-культурнай каштоўнасці, аўтар;

матэрыялы папярэдніх інжынерных даследаванняў;

праграму выканання навукова-праектных работ, з вызначэннем відаў і паслядоўнасці навукова-даследчых работ, якія павінны ўключаць археалагічныя даследаванні, архіўна-бібліяграфічныя даследаванні, натурныя даследаванні з вызначэннем месцаў выканання зандажоў, шурфоў, адбору проб будаўнічых матэрыялаў, методыку і апісанне правядзення рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ з вызначэннем іх чарговасці;

рэкамендацыі па выкананню першачарговых супрацьаварыйных работ пры іх неабходнасці;

каштарыс-калькуляцыю на выкананне навукова-праектных работ, навуковае кіраўніцтва і аўтарскі нагляд за рэстаўрацыйна-аднаўленчымі работамі.

7. Падрыхтоўка раздзела навукова-праектнай дакументацыі “Комплексныя навуковыя даследаванні” праводзіцца да пачатку і, пры неабходнасці, у працэсе рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ у мэтах:

атрымання матэрыялаў аб гісторыка-культурных і архітэктурна-мастацкіх вартасцях гісторыка-культурнай каштоўнасці;

падрыхтоўкі дадзеных для навуковага абгрунтавання праектных рашэнняў і вызначэння комплекса мер па захаванню гісторыка-культурнай каштоўнасці;

ацэнкі ступені захаванасці і вартасці дэталяў, канструкцый і матэрыялаў, з якіх створана гісторыка-культурная каштоўнасць;

прыняцця рашэнняў па вывядзенню гісторыка-культурнай каштоўнасці з аварыйнага стану;

выяўлення розных наслаенняў і пераробак, пошуку слядоў і рэшткаў парушаных і страчаных дэталяў гісторыка-культурнай каштоўнасці, па якіх могуць быць з максімальнай дакладнасцю і верагоднасцю адноўлены ўсе страты, на вызначэнне ступені захаванасці канструктыўнага стану гісторыка-культурнай каштоўнасці, яе асобных элементаў і дэталяў.

Атрыманыя ў выніку навуковых даследаванняў сістэматызаваныя матэрыялы аналізуюцца і з’яўляюцца асновай для прыняцця навуковага абгрунтавання прымаемых праектных рашэнняў.

Відамі комплексных навуковых даследаванняў з’яўляюцца гісторыка-архіўныя, бібліяграфічныя і натурныя даследаванні.

7.1. Вынікі праведзеных гісторыка-архіўных і бібліяграфічных даследаванняў уключаюцца ў тлумачальную запіску, у якой адлюстроўваюцца:

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

пералік раней распрацаванай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці;

спіс бібліяграфічных, архіўных і (або) іншых крыніц, якія былі выкарыстаны пры падрыхтоўцы кароткай або поўнай гістарычнай даведкі аб гісторыка-культурнай каштоўнасці і (або) яе аналагах;

выпіскі з архіўных, бібліяграфічных і (або) іншых крыніц, якія даюць магчымасць вызначыць кола гістарычных падзей і прычын, у выніку якіх была створана і (або) відазмянялася гісторыка-культурная каштоўнасць, прасачыць гісторыю яе бытавання, ролю ў навакольным асяроддзі і культурна-мастацкае значэнне;

фотакопіі ці выкапіроўкі пісьмовых, графічных і выяўленчых матэрыялаў, якія датычаць, у тым ліку, аналагаў, неабходныя для дастатковай характарыстыкі гісторыі стварэння і (або) развіцця гісторыка-культурнай каштоўнасці;

архітэктурна-мастацкі аналіз гісторыка-культурнай каштоўнасці, кароткая гісторыя мясцовасці, дзе яна была пабудавана, кароткая характарыстыка навакольнай гістарычнай забудовы;

звесткі аб архітэктарах, будаўніках, уладальніках (уласніках, карыстальніках) гісторыка-культурнай каштоўнасці;

змены функцыянальнага выкарыстання і прыстасавання гісторыка-культурнай каштоўнасці за час яе існавання,

апісанне разбурэнняў, рамонтаў, перабудоў, а таксама праведзеных рэстаўрацыйна-аднаўленчых работах, ужытых архітэктурных і канструктыўных рашэнняў, будаўнічых прыёмах і матэрыялах, інжынерным абсталяванні, аналіз наяўнай раней распрацаванай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці.

7.2. Вынікі праведзеных натурных даследаванняў уключаюцца ў тлумачальную запіску і, ў залежнасці ад праграмы выканання навукова-праектных работ, павінны складацца з:

матэрыялаў археалагічных даследаванняў гісторыка-культурнай каштоўнасці, у тым ліку прылеглай тэрыторыі на якой плануецца правядзенне земляных і будаўнічых работ;

матэрыялаў інжынерна-геалагічных і тапаграфічных даследаванняў;

матэрыялаў па інжынерных і дэндралагічных даследаваннях;

кракоў і чарцяжоў абмераў гісторыка-культурнай каштоўнасці;

дадзеных, атрыманых па выніках даследаванняў у зандажах, шурфах, пры раскрыццях канструкцый з вызначэннем аўтэнтычных элементаў і матэрыялаў гісторыка-культурнай каштоўнасці ці іх рэштак і слядоў, характару апрацоўкі (аздобы), ужытых будаўнічых і тэхналагічных прыёмаў, тэхнічнага стану і прычын дэфектаў, якія даюць магчымасць

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

прасачыць змяненне гісторыка-культурнай каштоўнасці ў часе, правесці параўнальны аналіз з дадзенымі гісторыка-архіўных і бібліяграфічных даследаванняў і рэкамендаваць метад рэстаўрацыі, з фотафіксацыяй зандажоў, шурфоў, вынікаў названых вышэй раскрыццяў;

графічных і іншых фіксацыйных матэрыялаў па натурных даследаваннях;

звестак па выніках даследаванняў манументальнага жывапісу, прадметаў унутранай аздобы;

звестак па выніках лабараторнага аналізу проб і ўзораў будаўнічых і апрацоўчых матэрыялаў, з улікам якіх выпрацоўваюцца рэкамендацыі адносна прымянення будаўнічых матэрыялаў і матэрыялаў аддзелак;

разлікаў нясучай здольнасці канструкцый і падмуркаў, цеплатэхнічных, светлатэхнічных і акустычных параметраў гісторыка-культурнай каштоўнасці;

даследаванняў і разлікаў па вызначэнню аптымальных фізіка-тэхнічных параметраў і тэмпературна-вільготнаснага рэжыму гісторыка-культурнай каштоўнасці ў мэтах забеспячэння яе фізічнага даўгалецця і захаванасці пры сучасным выкарыстанні з улікам уплыву антрапагенных, тэхнагенных і прыродна-кліматычных уздзеянняў, існуючай ці plануемай тапаграфічнай, ландшафтнай і горадабудаўнічай сітуацыі, гідрагеалагічных умоў і паводзінаў грунтоў падмурка;

распрацоўкі метадаў абароны ад неспрыяльных уздзеянняў на будаўнічыя і апрацоўчыя матэрыялы і метадаў іх кансервацыі;

методыкі распрацоўкі будаўнічых і апрацоўчых матэрыялаў, адпаведных першапачатковым ці блізкіх да іх па ўласцівасцях;

эксперыментальных даследаванняў і рэкамендацый па тэхналогіі асобных вызначаных відаў работ.

Аб'ём натурных даследаванняў вызначаецца ў праграме выканання навукова-праектных работ, з вызначэннем відаў і паслядоўнасці навукова-даследчых работ, якая рыхтуецца згодна з пунктам 6 дадзенай Інструкцыі.

8. Раздзел "Праектная дакументацыя" выконваецца ў адпаведнасці з БНБ 1.03.02-05 "Склад, парадак распрацоўкі і ўзгаднення праектнай дакументацыі ў будаўніцтве". Стадыйнасць праектавання вызначаецца ў залежнасці ад складанасці і стану гісторыка-культурнай каштоўнасці.

У выпадку неабходнасці выканання першачарговых супрацьаварыйных работ на гэтыя віды работ рыхтуецца праектная дакументацыя.

9. Каштарысная дакументацыя рыхтуецца для вызначэння кошта рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ у адпаведнасці з парадкам, вызначаным заканадаўствам.

10. Навукова-рэстаўрацыйная справаздача складаецца навуковым кіраўніком, пры неабходнасці з ўдзелам іншых спецыялістаў, што

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

правoдзілі нагляд за работамі ў канцы кожнага каляндарнага года пры распрацоўцы навукова-праектнай дакументацыі і выкананні рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ і пасля заканчэння рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ.

Навукова-рэстаўрацыйная справаздача павінна змяшчаць:

змест і вынікі комплексных навуковых даследаванняў;

кароткі змест зацвярджаемай часткі праектнай дакументацыі;

змены, унесеныя ў праект у працэсе правядзення работ;

апісанне зробленых работ па іх відах з пазначэннем прыменены тэхналогій;

звесткі аб будаўнічых і апрацоўчых матэрыялах, вырабах, канструкцыях і абсталяванні. якія былі выкарыстаны;

навуковая ацэнка вынікаў рэстаўрацыі.

Да справаздачы дадаюцца фотафіксацыйныя матэрыялы, якія прадстаўляюць выгляд гісторыка-культурнай каштоўнасці і яе стан да пачатку работ, у працэсе даследаванняў і правядзення работ і пасля заканчэння рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ.

Складзеная навукова-рэстаўрацыйная справаздача накіроўваецца ў Міністэрства культуры і з’яўляецца падставай для падрыхтоўкі дазволу на выкананне работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці і заключэння аб уводзе аб’екта будаўніцтва ў эксплуатацыю.

11. У выпадку паэтапнага выканання рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ з паралельным праектаваннем, Міністэрства культуры ўзгодняе навукова-праектную дакументацыю на кожны асобны этап работ.

12. У склад навукова-праектнай дакументацыі, якая перадаецца выканаўцам заказчыку, не ўключаюцца кракі абмераў, разлікі будаўнічых канструкцый, журнал лабараторных даследаванняў, негатывы фотафіксацый, а таксама некаторыя падрыхтоўчыя матэрыялы гісторыка-архіўных і натурных даследаванняў.

Усе арыгіналы навукова-праектнай дакументацыі захоўваюцца ў архіве (ген-) праектнай арганізацыі.

13. Распрацаваная навукова-праектная дакументацыя можа ўтрымліваць іншыя раздзелы, якія вызначаны будаўнічымі нормамі і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 3
## ПАРАДАК РАСПРАЦОЎКІ НАВУКОВА-ПРАЕКТНАЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ

14. Распрацоўка навукова-праектнай дакументацыі ажыццяўляецца праектыроўшчыкамі - праектнымі арганізацыямі (адной або некалькімі), якія маюць на гэта адпаведную ліцэнзію і ў якіх працуюць спецыялісты,

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

якія маюць пасведчанне на права выканання навукова-даследчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі, атрыманае ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

15. Распрацоўка навукова-праектнай дакументацыі праводзіцца з пісьмовага дазволу на выкананне работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці, які выдаецца Міністэрствам культуры ў адпаведнасці з заканадаўствам, пасля ўзгаднення абгрунтаванай праграмы навукова-даследчых работ.

Абгрунтаваная праграма навукова-даследчых работ складаецца навуковым кіраўніком сумесна з заказчыкам па форме згодна з дадаткам 1 да дадзенай Інструкцыі.

Абгрунтаваная праграма навукова-даследчых работ складаецца ў трох экзэмплярах і прадстаўляецца на узгадненне і зацвярджэнне ў Міністэрства культуры.

16. Распрацоўка навукова-праектнай дакументацыі павінна ажыцяўляцца пад кіраўніцтвам навуковага кіраўніка, які прызначаецца Міністэрствам культуры ва ўстаноўленым парадку і нясе персанальную адказнасць за захаванне адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей гісторыка-культурных каштоўнасцей, а таксама за навуковую абгрунтаванасць праектных рашэнняў, што азначаецца ў дазволе на выкананне работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці Міністэрства культуры.

17. Навукова-праектная дакументацыя абавязкова павінна распрацоўвацца з выкананнем асобых умоў, якія вызначаны ў дазволе Міністэрства культуры.

18. Распрацоўку праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці належыць ажыццяўляць у адпаведнасці з БНБ 1.03.02-05 "Склад, парадак распрацоўкі і ўзгаднення праектнай дакументацыі ў будаўніцтве" на падставе праведзеных комплексных навуковых даследаванняў.

19. У выпадках выяўлення новых невядомых раней звестак аб гісторыка-культурнай каштоўнасці і (або) вартасцей гісторыка-культурнай каштоўнасці, атрыманых пры раскрыцці дэталяў і фрагментаў пад час выканання рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, на гэтыя звесткі і раскрыцці складаецца акт згодна з дадаткам 2 да дадзенай Інструкцыі.

Выяўленыя звесткі могуць з'явіцца падставай для ўнясення ва ўзгодненую і зацверджаную ва ўстаноўленым парадку навукова-праектную дакументацыю адпаведных змяненняў, якія падлягаюць узгадненню і зацвярджэнню згодна дзеючых прававых норм і дадзенай Інструкцыі.

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Усе змяненні і дапаўненні, якія ў адпаведным парадку ўносяцца ў навукова-праектную дакументацыю пры выкананні рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ, павінны папярэдне быць узгоднены з навуковым кіраўніком і заверaны яго подпісам.

20. Унясенне карэкціровак у праектныя рашэнні без узгаднення навуковага кіраўніка не дапускаецца.

## ГЛАВА 4
## УЗГАДНЕННЕ НАВУКОВА-ПРАЕКТНАЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ

21. Навукова-праектная дакументацыя павінна быць узгоднена ў Міністэрстве культуры.

Узгадненне навукова-праектнай дакументацыі адлюстроўваецца ў заключэнні па навукова-праентнай дакументацыіі, падрыхтаванай па форме згодна з дадаткам 3 да дадзенай Інструкцыі.

22. Для разгляду распрацаванай навукова-праектнай дакументацыі і атрымання заключэння па ёй заказчыку або даручэнню заказчыка праектыроўшчыку неабходна накіраваць у Міністэрства культуры пісьмовую заяву і адзін камплект навукова-праектнай дакументацыі ў складзе, вызначаным главой 2 дадзенай Інструкцыі.

23. Навукова-праектная дакументацыя, якая прадстаўляецца на ўзгадненне ў Міністэрства культуры, павінна быць падпісана навуковым кіраўніком.

Узгадненне навуковага кіраўніка адлюстроўваецца подпісам на першых лістах тлумачальных запісак раздзелаў “Папярэднія работы”, “Комплексныя навуковыя даследаванні”, “Праектная дакументацыя” і на першым лісце чарцяжоў архітэктурнага і (або) будаўнічага праекта.

Па выніках разгляду навукова-праектнай дакументацыі Міністэрствам культуры выдаецца заключэнне.

24. Навукова-праектная дакументацыя на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, рэалізацыя якой можа прывесці да істотнага змянення гісторыка-культурных каштоўнасцей катэгорый "0", "1", "2" ці да іх знішчэння, страты ці знікнення, папярэдне разглядаецца на пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь (далей - навукова-метадычная рада).

На падставе рашэння навукова-метадычнай рады рыхтуецца заключэнне Міністэрства культуры адпаведнай формы.

Па выніках разгляду навукова-праектнай дакументацыі, якая не адобрана навукова-метадычнай радай, рыхтуецца заключэнне з адмовай ва ўзгадненні з вызначэннем умоў, які падлягаюць выкананню.

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

25. Разгляд прадстаўленай навукова-праектнай дакументацыі і падрыхтоўка заключэння па навукова-праектнай дакументацыі ажыццяўляецца на працягу 21 дня з дня рэгістрацыі пісьмовага звароту ў Міністэрства культуры або 15 дзён пасля разгляду навукова-метадычнай радай.

26. Абарону праектнай дакументацыі пры ўзгадненні ажыццяўляе распрацоўшчык, або прадстаўнік выканаўцы праектнай дакументацыі і навуковы кіраўнік.

27. У выпадку заўваг Міністэрства культуры, азначаных у заключэнні па навукова-праектнай дакументацыі, выканаўца абавязаны на працягу месяца разгледзець і ўнесці выпраўленні і дапаўненні ў дакументацыю, а пры нязгодзе з заўвагамі - звярнуцца ў Міністэрства культуры для вырашэння спрэчных пытанняў.

28. Пасля ўзгаднення і выдачы заключэння па праектнай дакументацыі навукова-праектная дакументацыя, перадаецца Міністэрствам культуры ў Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

29. Узгадненне з Міністэрствам культуры навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях не вызваляе ад неабходнасці яе ўзгаднення з іншымі дзяржаўнымі органамі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

30. Зацвярджэнне навукова-праектнай дакументацыі заказчыкам магчыма толькі пасля яе ўзгаднення Міністэрствам культуры і станоўчага заключэння пазаведамаснай экспэртызы праектаў.

31. Калі на працягу двух гадоў рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы на гісторыка-культурнай каштоўнасці па ўзгодненай навукова-праектнай дакументацыі не праводзіліся, навукова-праектная дакументацыя падлягае пераўзгадненню ў Міністэрстве культуры, пры гэтым у ходзе такога разгляду павінны быць улічаны палажэнні прынятых у гэты перыяд нарматыўных прававых актаў і іншыя акалічнасці, якія вынікаюць з умоў захавання і належнага выкарыстання гісторыка-культурнай каштоўнасці.

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Дадатак 1
да Інструкцыі аб складзе, парадку распрацоўкі і ўзгаднення навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях

ФОРМА

ЗАЦВЯРДЖАЮ:
Намеснік Міністра культуры
Рэспублікі Беларусь
________________ ______________
*подпіс* *Ініцыялы, прозвішча,*
«___»___________200__г.
М.П.

АБГРУНТАВАНАЯ ПРАГРАМА
НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫХ І ПРАЕКТНЫХ РАБОТ
№_______________

1. Гісторыка-культурная каштоўнасць:___________________________________
*назва і адрас*
2. Заказчык:_____________________________________________________
*назва юрыдычный асобы, або прозвішча фізічнай асобы або індывідуальнага прадпрымальніка*
*юрыдычная назва*
3. Генпраектная і (або) праектная арганізыцыя : __________________________
4. Звесткі аб гісторыка-культурнай каштоўнасці:
4.1. Статус і катэгорыя гісторыка-культурнай каштоўнасці “___” згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад _____________ № ____
4.2. Шыфр __________ у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь
5. Апісанне і кароткія гістарычныя звесткі гісторыка-культурнай каштоўнасці:
________________________________________________________________
*характырыстыка знешняга выгляду, матэрыялаў будаўніцтва, звесткі аб даце стварэння*
________________________________________________________________
*і пераробак,аўтары, асаблівасцей фарміравання, выяўленых мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей*
6. Агульны тэхнічны стан: ________________________________________
*здавальняльны або не здавальняльны*
7. Характар плануемых работ: ____________________________________
*апісанне згодна заданню на праектаванне*
8. Умовы прыстасавання аб’екта пад сучасныя мэты: _______________
________________________________________________________________
*вызначэнне характару і ўмоў выкарыстання гісторыка-культурнай каштоўнасці або яе часткі*
9. Добраўпарадкаванне тэрыторыі: __________________________________
*указваць пры неабходнасці з вызначэннем межаў работ*
10. Наяўнасць праектна-даследчай дакументацыі (якая распрацавана у пяпярэднія гады і можа быць выкарыстанна зараз): ______________________

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

*аб'ектны нумар, год выканання і*

___

*назва праектнай дакументацыі, юрыдычная назва праектнай арганізацыі – распрацоўшчыка,*

11. Склад навукова-даследчых работ:

11.1. Папярэднія работы: ___

*вызначыць пералік работ, якія падлягаюць выкананню згодна з пунктам 6*

___

*Інструкцыі аб складзе, парадку распрацоўкі і ўзгаднення навукова-праектнай дакументацыі на выкананне*

___

*рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях*

11.2. Комплексныя навуковыя даследаванні: (вызначыць неабходнасць выканання і, пры магчымасці, аб'ём работ)

Архіўныя і бібліяграфічныя матэрыялы, складанне гістарычнай запіскі;
Натурныя даследаванні (абмеры, зандажы, шурфы);
Археалагічныя даследаванні тэрыторыі земляных работ і будаўніцтва;
Фотафіксацыя;
Лабараторныя даследаванні будаўнічых і апрацоўчых матэрыялаў.

11.3 Навукова-рэстаўрацыйная справаздача: ___;

12. Склад і стадыйнасць праектнай дакументацыі: (аднастадыйнае або двухстадыйнае праектаванне) ___

13. Неабходнасць прадстаўлення макета, перспектыў, разгортак і інш.:___

14. Дакументацыя на першапачатковыя і супрацьаварыйныя работы (вызначыць патрэбнасць выканання і, пры магчымасці, аб'ём работ) ___:

15. Прадугледзець прадстаўленне аднаго экзэмпляра навукова-праектнай дакументацыі для фарміравання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь.

16. Заказчыку работ прадстаўляць ў Міністэрства культуры навукова-рэстаўрацыйную справаздачу, складзеную навуковым кіраўніком пры ўдзеле іншых спецыялістаў, якія праводзілі нагляд за работамі, на прыканцы кожнага года пры правядзенні рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці на працягу некалькіх гадоў і пасля заканчэння ўсіх рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці.

17. Парадак правядзення навуковага кіраўніцтва ___

18. Дадатковыя патрабаванні: ___

Навуковы кіраўнік

«___»______200_ г. ___ ___

*дата складання* *подпіс* *прозвішча, імя, імя па бацьку*

Узгоднена:
Начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь ___ ___

*подпіс* *ініцыялы, прозвішча*

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Дадатак 2
да Інструкцыі аб складзе, парадку распрацоўкі і ўзгаднення навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях

ФОРМА

АКТ
агляду тэхнічнага стану, выяўленных адметных звестак і (або) вартасцей гісторыка-культурнай каштоўнасці

«_____» ________________ 20__г.

Назва гісторыка-культурнай каштоўнасці:
________________________________________________________________
*згодна Дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь*
________________________________________________________________
Месцазнаходжанне:___________________________________________
*адрас гісторыка-культурай каштоўнасці*

Камісія ў складзе:
ад мясцовага выканаўчага і распарадчага органа
*(пасада, назва установы)* ________________________________
*прозвішча, імя, імя па бацьку*
____________________________________

прадстаўнік заказчыка
*(пасада, назва юрыдычнай асобы)* ________________________________
*прозвішча, імя, імя па бацьку*
____________________________________

навуковы кіраўнік ________________________________
*прозвішча, імя, імя па бацьку*
____________________________________

прадстаўнік (ген-) праектнай арганізацыі
*(пасада, назва установы)* ________________________________
*прозвішча, імя, імя па бацьку*
____________________________________

склалі дадзены акт аб тым, што «_____» _________ 20__г. праведзены агляд тэхнічнага стану гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Па выніках агляду вызначана: (прадставіць звесткі ў форме апісання элементаў, якія ўваходзяць у склад каштоўнасці):

1. Агульны стан гісторыка-культурнай каштоўнасці _______________
*кароткая характарыстыка аб’екта, кароткая даведка гісторыі стварэння;*

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

2. Стан знешніх архітэктурна-канструктыўных элементаў каштоўнасці (указаць патрэбнае з апісаннем матэрыялаў і адметных якасцей):

2.1. агульны стан ______________________________
*задавальняючы, незадавальняючы, або іншае*

2.2. падмуркі ______________________________

2.3. цокаль, адмостка ______________________________

2.4. сцены ______________________________

2.5. дах – кроквы, латы, пакрыццё, элементы водаадвода __________

______________________________

2.6. завяршэнне – главы, шатры, іх канструкцыі і пакрыцце __________

______________________________

2.7. знешняе дэкаратыўнае аздабленне фасадаў - абліцоўка, афарбоўка, карнізы, дэкор, скульптура, жывапіс ______________________________

3. Стан унутраных архітэктурна-канструктыўных элементаў гісторыка-культурнай каштоўнасці (указаць патрэбнае з апісаннем матэрыялаў і адметных якасцей):

3.1. агульны стан *(задавальняючы, незадавальняючы, адсутнічае)* __________

3.2. перакрыцці ______________________________

3.3. падлога ______________________________

3.4. сцены ______________________________

3.5. слупы, калоны ______________________________

3.6. дзверы, вокны, ______________________________

3.7. лесвіцы______________________________

3.8. дэкаратыўнае аздабленне - ляпны дэкор, скульптура, жывапіс _______

______________________________

4. Сад, двор, парк, агароджа ______________________________

5. Дадатковыя звесткі______________________________

Камісіяй рэкамендавана:______________________________
*вызначыць прынятыя рашэнні, рэкамендацыі*

______________________________
*па парадку правядзення работ*

______________________________

Дадаткі *(прыкласці . планы паверхаў (інвентарныя), генплан фота, інш. )*: на _____ л.

Камісія:

| | | |
|---|---|---|
| ____________ | ____________ | ____________ |
| *пасада* | *подпіс* | *прозвішча, імя, імя па бацьку* |
| ____________ | ____________ | ____________ |
| *пасада* | *подпіс* | *прозвішча, імя, імя па бацьку* |

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Дадатак 3
да Інструкцыі аб складзе, парадку распрацоўкі і ўзгаднення навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях

ФОРМА

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

220004, г. Мінск, праспект Пераможцаў, 11, тэл. ( 017 ) 203 75 74, факс 203 90 45

**З А К Л Ю Ч Э Н Н Е**

па навукова-праектнай дакументацыі

**ад ______________ № _____/_______**

Па ____________________________________________________________

*назва праектнай дакументацыі*

Заказчык - _______________________________________________________

*юрыдычная назва*

Праектная арганізацыя – __________________________________________

*юрыдычная назва*

Аб'ектны нумар праектнай дакументацыі – _________________

Галоўны архітэктар праекта – ____________________________

*прозвішча, ініцыялы*

Гісторыка-культурная каштоўнасць катэгорыі "____" – _________________

*назва і адрас*

_______________________________________________________________

*згодна Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь*

у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад_________№ _____, (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 200_ г., № ______ ), шыфр_________ у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Адказным за захаванасць гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама за навуковую абгрунтаванасць праектных рашэнняў і іх рэалізацыю з'яўляецца навуковы кіраўнік - ___________________________

*прозвішча, імя, імя па бацьку*

Праектная дакументацыя выканана на падставе ______________________

*звесткі: аб дазволе (дата, № ),*

_______________________________________________________________

*абгрунтаванай праграме навукова-даследчых и праектных рабо, навукова-даследчых работ, інш*

ЗАКЛЮЧЭННЕ: ________________________________________________

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

*назва навукова-праектнай дакументацыіі і заключэнне па выніках яе разгляду*

АСОБЫЯ УМОВЫ: *(пры неабходнасці)* ______________________________
______________________________________________________

Намеснік Міністра ____________________ ____________________

М. П. *подпіс* *ініцыялы, прозвішча*

UNESCO Cultural Heritage Laws Database
(Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

ЗАЦВЕРДЖАНА
пастанова Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
“ 21 ” мая 2007 г. № 21

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку назначэння навуковага кіраўніка пры выкананні работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці, яго правы і абавязкі

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак назначэння навуковага кіраўніка пры выкананні работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей - навуковы кіраўнік), яго правы і абавязкі і накiравана на выкананне патрабаванняў Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь” (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., № 9, 2/1195) (далей – закон).

2. Дзейнасць і адказнасць навуковага кіраўніка вызначана заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з якім ён ажыццяўляе кіраўніцтва ходам работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, у тым ліку праводзіць аўтарскі нагляд за выкананнем гэтых работ, нясе персанальную адказнасць за захаванне адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей гісторыка-культурных каштоўнасцей, а таксама за навуковую абгрунтаванасць праектных рашэнняў і іх рэалізацыю.

3. Кандыдатура, якая прадстаўляецца для назначэння навуковым кіраўніком, павінна мець пасведчане на права кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і аўтарскі нагляд за іх выкананнем, атрыманае ў парадку, які вызначаны заканадаўствам.

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

4. У сваёй дзейнасці навуковы кіраўнік кіруецца заканадаўствам у сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, архітэктурнай, будаўнічай і горадабудаўнічай дзейнасці і дадзенай Інструкцыяй.

5. Навуковы кіраўнік у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь атрымлівае плату за выкананне сваіх абавязкаў і функцый і кампенсацыю за звязаныя з гэтым выдаткі за кошт юрыдычнай або (і) фізічнай асобы, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, зацікаўленай у выкананні работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Рэалізацыю правоў і абавязкаў навуковага кіраўніка адміністратыўнымі і эканамічнымі мерамі павінен забяспечваць заказчык распрацоўкі навукова-праектнай дакументацыі і правядзення рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці.

6. Затраты навуковага кіраўніка, звязаныя з ажыццяўленнем кіраўніцтва ходам работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, у тым ліку правядзенні аўтарскага нагляду за выкананнем гэтых работ, вызначаюцца на падставе дагавора паміж заказчыкам і навуковым кіраўніком.

## ГЛАВА 2
## ПАРАДАК НАЗНАЧЭННЯ НАВУКОВАГА КІРАЎНІКА

7. Назначэнне навуковага кіраўніка ажыццяўляецца Міністэрствам культуры на падставе прапаноў, накіраваных заказчыкам або кіраўніцтвам праектных ці навукова-даследчых устаноў, у складзе:

пісьмовая заява аб прызначэнні навуковага кіраўніка;

копія дыплома кандыдата, які прапанаваны на назначэнне навуковага кіраўніка;

выпіска з працоўнай кніжкі або натарыяльна засведчаная копія працоўнай кніжкі аб працы ў перыяд трох апошніх гадоў;

вытворчая характарыстыка кандыдата (за подпісам кіраўніка праектнай арганізацыі або іншага навуковага кіраўніка);

звесткі, якія пацвярджаюць наяўнасць адпаведнай кваліфікацыі і вопыту работы ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны (пералік выкананых работ, удзел у праектаванні па аб’ектам гісторыка-культурнай спадчыны, інш.).

8. Назначэнне навуковага кіраўніка для выканання работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях катэгорый "0", "1", "2" ажыццяўляецца Міністэрствам культуры на падставе станоўчага рашэння па выніках разгляду гэтай прапановы на пасяджэнні Беларускай

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь (далей – Навукова-метадычная рада).

9. Па выніках разгляду прапановы Міністэрствам культуры рыхтуецца прызначэнне навуковага кіраўніка па форме згодна з дадаткам да дадзенай Інструкцыі.

10. Падрыхтоўка прызначэння ажыццяўляецца ў 20-дзённы тэрмін з дня прыёма пісьмовай заявы з матэрыяламі, якія вызначаны у пункце 7 дадзенай Інструкцыі або прыняцца рашэння Навукова-метадычнай радай.

11. Падрыхтаванае прызначэнне накіроўваецца ў адрас заказчыка работ, (ген-) праектнай арганізацыі і ў прадрыемства, дзе працуе навуковы кіраўнік.

## ГЛАВА 3
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ НАВУКОВАГА КІРАЎНІКА

12. Навуковы кіраўнік ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва працэсам праектавання і павінен быць уключаны ў склад творчага калектыву і пералік асоб, якія ажыццяўляюць аўтарскі нагляд за выкананнем работ на аб’екце, незалежна ад таго, якая праектная арганізацыя з’яўлялась (ген-) праектыроўшчыкам і распрацоўвала навукова-праектную дакументацыю.

13. Навуковы кіраўнік мае права прыпыняць правядзенне асобных відаў работ, аб чым робіцца запіс у журнале аўтарскага нагляду:

пры неабходнасці даследавання і фіксацыі недаследаваных частак і дэталей гісторыка-культурнай каштоўнасці або нанава выяўленых яе адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей;

для прыняцця мер для захавання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у выпадках стварэння пагрозы знішчэння гісторыка-культурных каштоўнасцей;

пры прычыненні любых відаў шкоды гісторыка-культурным каштоўнасцям, пагаршэнні тэхнічнага стану або стварэнні пагрозы такога пагаршэння;

у выпадках правядзення работ, якія могуць выклікаць навукова неабгрунтаваныя змяненні гісторыка-культурнай каштоўнасці і пагаршэнне ўмоў яе ўспрымання;

пры адступленні ад рашэнняў навукова-праектнай дакументацыі і ўказанняў навуковага кіраўніка ў ходзе правядзення рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ.

14. Навуковы кіраўнік мае права патрабаваць ад усіх выканаўцаў і ўдзельнікаў рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ выканання патрабаванняў заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны і дадзенай Інструкцыі, іншых актаў заканадаўства.

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Указанні навуковага кіраўніка з'яўляюцца абавязковымі для заказчыка, усіх службовых асоб, праектных арганізацый, падрадных вытворчых арганізацый і могуць быць адменены толькі Міністэрствам культуры па выніках разгляду сутнасці справы Навукова-метадычнай радай.

15. Навуковы кіраўнік абавязаны:

ажыццяўляць каардынацыю дзейнасці ўсіх падраздзяленняў, занятых у распрацоўцы навукова-праектнай дакументацыі.

прымаць удзел у падрыхтоўцы і прадстаўленні на ўзгадненне абгрунтаванай праграмы навукова-даследчых работ;

забяспечваць выкананне натурных даследаванняў гісторыка-культурнай каштоўнасці, у тым ліку з неабходнай фіксацыяй і аналізам у працэсе вытворчасці работ, і распрацоўку навукова-праектнай дакументацыі ў адпаведнасці з палажэннямі дадзенай Інструкцыі;

забяспечваць дакладнасць і паўнату вынікаў натурных даследаванняў гісторыка-культурнай каштоўнасці;

забяспечваць навуковую абгрунтаванасць і адпаведнасць прымаемых праектных рашэнняў пры ўмове зберажэння адметных вартасцей гісторыка-культурнай каштоўнасці;

забяспечваць своечасовае вырашэнне ўсіх пытанняў па навукова-праектнай дакументацыі, што ўзнікаюць у працэсе рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці;

забяспечваць узаемадзеянне падраздзяленняў і суб'ектаў гаспадарчай дзейнасці, задзейнічаных у распрацоўцы навукова-праектнай дакументацыі;

сумесна з заказчыкам забяспечваць вырашэнне ўсяго комплексу пытанняў па распрацоўцы навукова-праектнай дакументацыі пры атрыманні ў адпаведных службах дазваляльна-узгадняльнай дакументацыі і, у выпадку неабходнасці, з органамі пазаведамаснай экспертызы праектаў;

прымаць удзел ва ўзгадненні і абароне выкананай навукова-праектнай дакументацыі;

ажыццяўляць кантроль за выкананнем работ у адпаведнасці з зацверджанай ва ўстаноўленым парадку навукова-праектнай дакументацыяй;

забяспечваць навуковую фіксацыю гісторыка-культурнай каштоўнасці ў працэсе правядзення работ, фотафіксацыю да пачатку, у працэсе, а таксама пасля заканчэння работ;

фіксаваць у адзіным для ўсіх відаў работ журнале аўтарскага нагляду ўсе заўвагі ў ходзе выканання работ;

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

прымаць удзел у рабоце камісій па прыёму завершаных этапаў рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама пасля завяршэння работ па аб’екту;

рыхтаваць навукова-рэстаўрацыйныя справаздачы для атрымання дазволаў на выкананне работ і заключэнняў Міністэрства культуры аб уводзе аб’екта будаўніцтва ў эксплуатацыю.

16. Выкананне абавязкаў, ускладзеных на навуковага кіраўніка, можа быць прыпынена пасля ўвода аб’екта ў эксплуатацыю, або ў выпадках, якія вызначаны заканадаўствам.

Адзначаныя ў абзацы першым гэтага пункта абавязкі могуць быць працягнуты ў сувязі з пачаткам новых рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці на падставе адпаведнага запіса ў дазволе Міністэрства культуры на выкананне работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці. У гэтым выпадку новага прызначэння навуковага кіраўніка не патрабуецца, калі не агаворына іншага ў падрыхтаваным у адпаведным парадку прызначэнні.

UNESCO Cultural Heritage Laws Database
(Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Дадатак
да Інструкцыі аб парадку назначэння навуковага кіраўніка пры выкананні работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці, яго правы і абавязкі

ФОРМА

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік Міністра культуры
Рэспублікі Беларусь

_________________ ______________
*подпіс* *Ініцыялы, прозвішча*

«___»____________200__г.
М.П.

ПРЫЗНАЧЭННЕ
навуковага кіраўніка
ад «__»________20__ г. № ___/___

У адпаведнасці з артыкулам 41 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь” (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., № 9, 2/1195) на падставе рашэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай Рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь ад “__”_______200_ г. (пратакол №___, пункт __) або па прадстаўленню (пісьмо ад №)

_______________________________________________________________
*укаазаць патрэбнае*

назначыць _______________________________________________
*прозвішча, імя, імя па бацьку, пасада, назва арганізацыі*

навуковым кіраўніком пры выкананні работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “___” _______________________________________________
*назва гісторыка-культурнай каштоўнасці, адрас*

якая пад шыфрам ____________ уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, на падставе пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад _______ №_____ (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2007 г., № __).

_______________________________________________________________
*Іншыя патрабаванні*

Начальнік упраўлення па ахове
гісторыка-культурнай спадчыны
і рэстаўрацыі Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
_______________________
*Подпіс, ініцыялы, прозвішча*

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Разаслана: ______________________________________________________________

*юрыдычная назва заказчыка, праектнай арганізацыі, арганізацыі дзе працуе навуковы кіраўнік*

Навуковы кіраўнік мае права:

прыпыняць правядзенне асобных відаў работ, аб чым робіцца запіс у журнале аўтарскага нагляду:

пры неабходнасці даследавання і фіксацыі недаследаваных частак і дэталей гісторыка-культурнай каштоўнасці або нанова выяўленых яе адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей;

для прыняцця мер для захавання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у выпадках стварэнні пагрозы знішчэння гісторыка-культурных каштоўнасцей;

пры прычыненні любых відаў шкоды гісторыка-культурным каштоўнасцям, пагаршэнні тэхнічнага стану або стварэнні пагрозы такога пагаршэння;

у выпадках правядзення работ, якія могуць выклікаць навукова неабгрунтаваныя змяненні гісторыка-культурнай каштоўнасці і пагаршэнне ўмоў яе ўспрымання;

пры адступленні ад рашэнняў навукова-праектнай дакументацыі і ўказанняў навуковага кіраўніка ў ходзе правядзення рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ.

Навуковы кіраўнік абавязаны:

ажыццяўляць каардынацыю дзейнасці ўсіх падраздзяленняў, занятых у распрацоўцы навукова-праектнай дакументацыі.

прымаць удзел у падрыхтоўцы і прадстаўленні на ўзгадненне абгрунтаванай праграмы навукова-даследчых работ;

забяспечваць выкананне натурных даследаванняў гісторыка-культурнай каштоўнасці, у тым ліку з неабходнай фіксацыяй і аналізам у працэсе вытворчасці работ, і распрацоўку навукова-праектнай дакументацыі ў адпаведнасці з палажэннямі дадзенай Інструкцыі;

забяспечваць дакладнасць і паўнату вынікаў натурных даследаванняў гісторыка-культурнай каштоўнасці;

забяспечваць навуковую абгрунтаванасць і адпаведнасць прымаемых праектных рашэнняў пры умове збераджэння адметных вартасцей гісторыка-культурнай каштоўнасці;

забяспечваць своечасовае вырашэнне ўсіх пытанняў па навукова-праектнай дакументацыі, што ўзнікаюць у працэсе рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці;

забяспечваць узаемадзеянне падраздзяленняў і суб’ектаў гаспадарчай дзейнасці, задзейнічаных у распрацоўцы навукова-праектнай дакументацыі;

сумесна з заказчыкам забяспечваць вырашэнне ўсяго комплексу пытанняў па распрацоўцы навукова-праектнай дакументацыі пры атрыманні ў адпаведных службах дазваляльна-узгадняльнай дакументацыі і, у выпадку неабходнасці, з органамі пазаведамаснай экспертызы праектаў;

прымаць удзел ва ўзгадненні і абароне выкананай навукова-праектнай дакументацыі;

ажыццяўляць кантроль за выкананнем работ у адпаведнасці з зацверджанай ва ўстаноўленым парадку навукова-праектнай дакументацыяй;

забяспечваць навуковую фіксацыю гісторыка-культурнай каштоўнасці ў працэсе правядзення работ, фотафіксацыю да пачатку, у працэсе, а таксама пасля заканчэння работ;

фіксаваць у адзіным для ўсіх відаў работ журнале аўтарскага нагляду ўсе заўвагі ў ходзе выканання работ;

прымаць удзел у рабоце камісій па прыёму завершаных этапаў рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама пасля завяршэння работ па аб’екту;

рыхтаваць навукова-рэстаўрацыйныя справаздачы для атрымання дазволаў на выкананне работ і заключэнняў Міністэрства культуры аб уводзе аб’екта будаўніцтва ў эксплуатацыю.

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

ЗАЦВЕРДЖАНА
пастанова Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
“ 21 ” мая 2007 г. № 21

ІНСТРУКЦЫЯ
аб складзе, парадку распрацоўкі і зацвярджэння праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная Інструкцыя распрацавана ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., № 9, 2/1195) і Законам Рэспублікі Беларусь от 5 июля 2004 года «Аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2004 г., № 109, 2/1049; 2006 г., № 106, 2/1233; № 122, 2/1259) і ўстанаўлівае склад, парадак распрацоўкі і зацвярджэння праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

2. Патрабаванні, вызначаныя ў дадзенай Інструкцы, накіраваны на забеспячэнне захавання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (далей - гісторыка-культурных каштоўнасцей) і іх навакольнага асяроддзя і абавязковы для выканання пры ажыццяўленні архітэктурнай, горадабудаўнічай, будаўнічай, гаспадарчай і іншай дзейнасці.

Праекты зон аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей (далей – праект зон аховы) распрацоўваюцца для кожнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

3. Устаноўленыя граніцы зон аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей і рэжымы іх выкарыстання павінны быць адлюстраваны ў адпаведным горадабудаўнічым кадастры.

Граніцы зон аховы наносяцца на асноўны чарцёж генеральнага плана населенага пункта або тэрытарыяльнай арганізацыі пэўнай мясцовасці, пазначаюцца на чарцяжах праектаў дэтальнай планіроўкі.

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

4. Адступленні ад устаноўленных праектам зон аховы рэжымаў утрымання і выкарыстання зон аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей забаронены.

5. У выпадку выяўлення новых гістарычных звестак, якія мяняюць уяўленне аб характары антрапагеннага і (або) прыроднага асяроддзя, якое акружае гісторыка-культурную каштоўнасць, можа быць праведзена карэктыроўка праекта зон аховы і зацвярджэнне яго ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам і дадзенай Інструкцыяй.

## ГЛАВА 2
## СКЛАД, ГРАНІЦЫ, РЭЖЫМЫ ЎТРЫМАННЯ І ВЫКАРЫСТАННЯ ЗОН АХОВЫ

6. Зоны аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей (далей – зоны аховы) – гэта спецыяльна ўстаноўленыя тэрыторыі, прызначаныя для забеспячэння захаванасці нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей і іх навакольнага асяроддзя.

7. Для гісторыка-культурных каштоўнасцей устанаўліваюцца наступныя зоны аховы:

ахоўная зона;

зона рэгулявання забудовы;

зона аховы ландшафту;

зона аховы культурнага пласта.

Неабходны склад зон аховы вызначаецца для кожнай гісторыка-культурнай каштоўнасці індывідуальна і можа ўключаць як усе зоны аховы, так і некаторыя з іх.

Памер, канфігурацыя зон аховы, адлегласць граніц зон аховы ад гісторыка-культурнай каштоўнасці вызначаюцца на стадыі распрацоўкі праекта зон аховы і ўстанаўліваюцца на падставе праведзеных навукова-даследчых работ з улікам асаблівасцей планіровачнай структуры.

Для кожнай зоны аховы ўстанаўліваюцца рэжымы іх утрымання і выкарыстання, якія прадугледжваюць абмежаванні або поўную забарону дзейнасці, якая ставарае пагрозу захаванню гісторыка-культурным каштоўнасцям і (або) іх навакольнаму асяроддзю.

8. Ахоўная зона – гэта тэрыторыя, якая непасрэдна акружае гісторыка-культурную каштоўнасць.

Ахоўная зона прызначана для забеспячэння фізічнай і эстэтычнай захаванасці гісторыка-культурнай каштоўнасці і яе навакольнага асяроддзя, выяўлення архітэктурна-мастацкай, горадабудаўнічай і планіровачнай якасці гісторыка-культурнай каштоўнасці, мэтазгоднага выкарыстання і найлепшага зрокавага ўспрымання.

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

У ахоўнай зоне павінны быць забяспечаны неабходныя для захаванасці гісторыка-культурнай каштоўнасці гідрагеалагічнае становішча, чысціня паветранага басейна і вадаёмаў, абарона ад дынамічных уздзеянняў і пажарная бяспека.

8.1. Рэжымы ўтрымання і выкарыстання ахоўнай зоны вызначаюцца з улікам гісторыка-культурнай каштоўнасці. Ахоўная зона мае асабліва строгі рэжым утрымання і выкарыстання.

Рэжымамі ўтрымання і выкарыстання ахоўнай зоны павінна быць прадугледжана:

захаванне сістэмы каштоўнай гістарычнай планіроўкі ці яе фрагментаў, каштоўнай архітэктурнай забудовы і прыроднага ландшафту;

забеспячэнне найбольш спрыяльных умоў агляду, якія выяўляюць вартасці гісторыка-культурнай каштоўнасці;

рэзерваванне магчымасцей аднаўлення раней страчаных элементаў і параметраў гісторыка-культурнай каштоўнасці;

ліквідацыя або нейтралізацыя дысгарманічных элементаў, што парушаюць цэласнасць успрымання гісторыка-культурнай каштоўнасці;

выключэнне дзейнасці, якая пагражае захаванню гісторыка-культурнай каштоўнасці, рэгенерацыі гісторыка-горадабудаўнічага ці прыроднага асяроддзя;

забарона новага будаўніцтва;

вызначэнне ўмоў абмежаванняў пры правядзенні гаспадарчай дзейнасці.

У ахоўнай зоне могуць выконвацца наступныя віды работ:

звязаныя з захаваннем і аднаўленнем планіроўкі, будынкаў, збудаванняў і добраўпарадкаваннем тэрыторый, якія фарміруюць гістарычнае асяроддзе і акружэнне гісторыка-культурнай каштоўнасці;

звязаныя з упарадкаваннем дарог і дарожак, вонкавага асвятлення, азеляненнем, усталяваннем стэндаў і вітрын, што адносяцца да гісторыка-культурнай каштоўнасці, забеспячэннем іншых форм добраўпарадкавання, выкліканых патрабаваннямі сучаснага выкарыстання, але не парушаючых гістарычна каштоўнае горадабудаўнічае і (або) прыроднае асяроддзе, традыцыйны ландшафт;

звязаныя з вывадам з ахоўнай зоны прамысловых прадпрыемстваў, буйных майстэрняў, складоў, ліквідацыяй або нейтралізацыяй дысгарманічных пабудоў, якія могуць быць заменены будынкамі, збудаваннямі ці зялёнымі пасадкамі, што не перашкаджаюць захаванню і ўспрыманню гісторыка-культурнай каштоўнасці;

і іншыя, прадугледжаныя праектам зон аховы.

Праектам зон аховы можа быць прадугледжаны вывад прамысловых прадпрыемстваў, буйных рамонтных майстэрняў і складоў, што прычыняюць фізічныя і эстэтычныя страты гісторыка-культурным

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

каштоўнасцям і выклікаюць значныя грузавыя і транспартныя нагрузкі, прыводзяць да забруджвання глебы, паветра і вадаёмаў.

Тэрыторыя ахоўнай зоны павінна быць даступна для навуковага даследавання і для наведванняў.

8.2. Граніцы ахоўнай зоны ўстанаўліваюцца зыходзячы з умоў фізічнага захавання гісторыка-культурнай каштоўнасці і яе найлепшага ўспрымання. У граніцы ахоўнай зоны ўключаюцца тэрыторыя адкрытай прасторы, прылеглая да каштоўнасці, і ўчасткі з гістарычнай і мастацка-каштоўнай забудовай, ландшафтам.

Пры блізкім размяшчэнні некалькіх не звязаных паміж сабой гісторыка-культурных каштоўнасцей мэтазгоднай прызнаецца распрацоўка ахоўнай зоны, якая з'яўляецца агульнай для гэтых гісторыка-культурных каштоўнасцей, а таксама стварае ўмовы выяўлення традыцыйнага антрапагеннага і (або) прыроднага асяроддзя.

Граніцы ахоўнай зоны неабходна сумяшчаць з граніцамі планіровачных або прыродных аб'ектаў: габарытамі кварталаў, вуліцамі, плошчамі, дарогамі, берагамі рэк, рвамі, ляснымі ўзлескамі і іншымі.

Граніцы ахоўных зон з граніцамі гісторыка-культурнай каштоўнасці павінны наносіцца на падаснову пры распрацоўцы генеральнага плана і дэтальнага плана.

9. Зона рэгулявання забудовы – гэта тэрыторыя, неабходная для захавання ці рэгенерацыі гістарычна абумоўленай сістэмы планіроўкі, архітэктурнага, прыроднага акружэння і прасторавай структуры, для замацавання значэння гісторыка-культурнай каштоўнасці ў антрапагенным і (або) прыродным асяроддзі, стварэння неабходных умоў успрымання гісторыка-культурнай каштоўнасці.

9.1. Рэжым утрымання і выкарыстання зоны рэгулявання забудовы вызначаецца ўмовамі захавання своеасаблівасці архітэктурнага абрыса гістарычнай часткі населенага пункта і (або) прыроднага асяроддзя, якія акружаюць гісторыка-культурную каштоўнасць, выключэння магчымасці скажэння характару гістарычных планіроўкі, забудовы і (або) ландшафта, неспрыяльнага ўздзеяння новага будаўніцтва на гісторыка-культурныя каштоўнасці, ансамблі, панараму, сілуэт.

Рэжым выкарыстання ўлічвае канкрэтную сітуацыю ўзаемаўплыву гісторыка-культурных каштоўнасцей і новай забудовы.

У зоне рэгулявання забудовы:

захоўваюцца сістэма каштоўнай гістарычнай планіроўкі ці яе фрагменты, каштоўныя збудаванні і элементы ландшафту;

ствараюцца ўмовы, спрыяльныя для зроковага ўспрыняцця гісторыка-культурных каштоўнасцей;

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

замацоўваецца ці аднаўляецца горадафарміруючае або тэрытарыяльнае значэнне гісторыка-культурных каштоўнасцей у архітэктурна-прасторавай арганізацыі населенага пункта або ландшафта;

прадугледжваецца ліквідацыя ці нейтралізацыя дысгарманічных элементаў, што парушаюць цэласнасць кампазіцыі гісторыка-культурнай каштоўнасці;

устанаўліваюцца абмежаванні на новае будаўніцтва і рэжым рэгулявання гаспадарчай дзейнасці;

вызначаюцца патрабаванні па рэканструкцыі існуючай забудовы па функцыянальнаму прызначэнню, вышыні, характару архітэктурных элементаў, працягласці і маштабнасці будынкаў, выкарыстанню будаўнічых матэрыялаў, каляроваму рашэнню фасадаў, размяшчэнню вонкавай рэкламы, характару азелянення, прыёмам добраўпарадкавання і іншых паказчыках.

У залежнасці ад гістарычнай каштоўнасці планіроўкі і забудовы, іх месцазнаходжання ў дачыненні да гісторыка-культурных каштоўнасцей і іх значэння ў фарміраванні асяроддзя вызначаны наступныя віды рэгулявання забудовы:

тэрыторыі, якія непасрэдна прылягаюць да ахоўных зон гісторыка-культурных каштоўнасцей, а таксама да участкаў з гістарычна-каштоўнай планіроўкай, забудовай і (або) ландшафтам, дзе рэгуляванне новага будаўніцтва падпарадкавана асноўным заканамернасцям гістарычнай забудовы населенага пункта або традыцыйнага ландшафту, з захоўваннем агульнай маштабнай адпаведнасці новых будынкаў і збудаванняў, а таксама з улікам асаблівасцей гістарычнага асяроддзя;

тэрыторыі, адносна аддаленыя ад гісторыка-культурных каштоўнасцей, з планіроўкай, якая не мае дачынення да гістарычнай забудовы, на якой рэгуляванне вызначаецца задачамі агульнага кампазіцыйнага паяднання, захавання значэння гісторыка-культурных каштоўнасцей у забудове, у панараме населенага пункта і структуры ландшафта.

У зоне рэгулявання забудовы не дазваляецца размяшчаць новыя прамысловыя прадпрыемствы, транспартна-складскія і іншыя збудаванні, якія ствараюць транспартныя нагрузкі, вядуць да забруджвання паветранага і воднага басейнаў, з'яўляюцца небяспечнымі ў пажарных адносінах і выбухованебяспечнымі.

У зоне рэгулявання забудовы не дапускаецца будаўніцтва транспартных магістралей і развязак, эстакад, мастоў і іншых інжынерных збудаванняў, якія парушаюць гістарычны выгляд населенага пункта і традыцыйнае прыроднае асяроддзе.

9.2. Граніцы зоны рэгулявання забудовы вызначаюцца зыходзячы з зоны бачнасці гісторыка-культурнай каштоўнасці і візуальнага ўспрымання

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

прыроднага антрапагеннага і прыроднага асяроддзяў ад гэтай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

У граніцы зоны рэгулявання забудовы ўключаюцца тэрыторыі з гістарычнай планіровачнай і аб'ёмна-прасторавай структурай, а таксама з новай забудовай, у залежнасці ад месцазнаходжання асноўных кропак агляду гісторыка-культурных каштоўнасцей і гарадскіх панарам, неабходнасці забеспячэння рэгулявання вышыні і габарытаў новай забудовы на ўсю глыбіню бачнасці, які разгортваецца з гэтых кропак.

Для забеспячэння спрыяльных умоў візуальнага ўспрымання гісторыка-культурных каштоўнасцей і іх комплексаў неабходна:

не засланяць гісторыка-культурныя каштоўнасці новымі будынкамі ў кропках і зонах найлепшага візуальнага ўспрымання;

пазбягаць размяшчэння ў зоне бачнасці гісторыка-культурных каштоўнасцей новых будынкаў, якія фарміруюць неспрыяльны для ўспрымання гісторыка-культурных каштоўнасцей фон;

улічваць басейн бачнасці – зону актыўнага уплыву гісторыка-культурных каштоўнасцей пры ажыццяўленні комплекснай горадабудаўнічай рэканструкцыі тэрыторыі.

Граніцы зоны рэгуляванай забудовы вызначаюцца на падставе вывучэння гістарычна-архіўных і бібліяграфічных даследаванняў, аналізу дадзеных натурнага даследавання і фатаграфічных фіксацый, якія выяўляюць межы кампазіцыйнага ўздзеяння гістарачных збудаванняў і ансамбляў на навакольнае асяроддзе, а таксама разлікамі габарытаў новай забудовы, якая не павінна парушаць гістарычнае асяроддзе і адмоўна ўплываць на кампазіцыйную ролю гісторыка-культурных каштоўнасцей .

Граніцы зоны рэгулюемай забудовы неабходна сумяшчаць з планіровачнымі або прыроднымі межамі: габарытамі кварталаў, вуліцамі, дарогамі, плошчамі і г.д.

10. Зона аховы ландшафту – тэрыторыя, неабходная для захавання або рэгенерацыі ландшафта, што акружае гісторыка-культурную каштоўнасць.

Зона аховы ландшафта ўключае прыроднае акружэнне гісторыка-культурнай каштоўнасці, у тым ліку рэльеф, на якім вызнаецца месцазнаходжанне будынкаў і збудаванняў, што ўздзейнічаюць на цэласнасць успрыманне гісторыка-культурных каштоўнасцей.

10.1. Рэжым утрымання і выкарыстання зоны аховы ландшафту вызначаецца ўмовамі захавання гістарычнага ландшафту, які кампазіцыйна звязаны з гісторыка-культурнай каштоўнасцю.

У зоне аховы ландшафту:

захоўваецца гістарычна каштоўны рэльеф, водныя сістэмы, лясныя масівы, сельскія ландшафты і іншыя прыродныя аб'екты, якія гістарычна звязаны з гісторыка-культурнай каштоўнасцю;

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

забяспечваецца выяўленне гістарычнай ролі ландшафта ва ўспрыманні гісторыка-культурных каштоўнасцей;

аднаўляюцца лясы, праводзяцца мерапрыемствы па абароне лугавых, берагавых і іншых тэрыторый ад апоўзняў, размыва, умацоўваюцца схілы, яры, праводзяцца іншыя неабходныя прыродаахоўныя мерапрыемствы;

прадугледжваецца ліквідацыя або нейтралізацыя дысгарманічных элементаў ландшафта;

забараняецца або рэгулюецца будаўнічая і гаспадарчая дзейнасць.

На тэрыторыі зоны аховы ландшафту дапускаецца гаспадарчая дзейнасць, якая не наносіць шкоды ландшафту і не скажае яго, не патрабуе ўзвядзення новых капітальных пабудоў, якія скажаюць традыцыйнае прыроднае асяроддзе гісторыка-культурнай каштоўнасці. У адпаведнасці з умовамі рэжыма на вызначаных участках зоны аховы ландшафта магчымы сенакос, выпас жывёлы, палявыя, агародныя і іншыя работы, якія не вядуць да змянення навакольнага асяроддзя.

Адкрытыя паляны і сенажаці могуць быць выкарыстаны для эпізадычных масавых свят і гулянняў без будаўніцтва стацыянарных збудаванняў.

10.2. Граніцы зоны аховы ландшафта ўстанаўліваюцца зыходзячы з узаемасувязі гісторыка-культурнай каштоўнасці з прыроднымі ландшафтамі.

У граніцы зоны аховы ландшафта ўключаюцца тэрыторыі як натуральна прыродныя, так і тыя, што знаходзяцца пад антрапагенным ўздзеяннем, у залежнасці ад ступені ўрбанізацыі терыторыі.

У граніцах зоны аховы ландшафта павінна быць захавана або адноўлена характэрнае прыроднае асяроддзе (рэльеф, водныя сістэмы, лясы, палі, сельскі ландшафт і іншае).

Граніцы зоны аховы ландшафту неабходна сумяшчаць з планіровачнымі або прыроднымі межамі (вуліцамі, дарогамі, броўкамі схілаў, лініямі берагавой паласы, узлескамі і г.д.).

11. Зона аховы культурнага пласта – гэта тэрыторыя, якая прылягае да гісторыка-культурнай каштоўнасці, звязаная з ёю гістарычна і фукцыянальна і неабходна для захавання археалагічных аб’ектаў.

Зона аховы культурнага слоя ўстанаўліваецца для выяўлення, захавання і даследавання аб’ектаў археалогіі.

У зоне аховы культурнага пласта неабходна прадугледжваць правядзенне будаўнічых і земляных работ з умовай прыняцця неабходных мер па ахове археалагічных аб’ектаў у парадку, установленым заканадаўствам.

Граніцы зоны аховы культурнага пласта ўстанаўліваюцца на падставе архіўна-бібліяграфічных і археалагічных звестак.

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

У граніцы зоны аховы культурнага пласта ўключаюцца тэрыторыі, якія ўтрымліваюць матэрыяльныя аб'екты ці іх комплексы, што ўзніклі ў выніку жыццядзейнасці чалавека ад яго з'яўлення да перыяду новай гісторыі і выяўлены на аснове спецыяльных археалагічных метадаў.

12. Рэжымы ўтрымання і выкарыстання зон аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей садова-паркавага і ландшафтнага мастацтва вызначаюцца з улікам патрабаванняў прыродаахоўнага заканадаўства.

## ГЛАВА 3
## ПАРАДАК РАСПРАЦОЎКІ ПРАЕКТАЎ ЗОН АХОВЫ

13. Вызначаныя згодна з главой 2 дадзенай Інструкцыі склад, граніцы, рэжымы утрымання і выкарыстання зон аховы адражаюцца у праекце зон аховы.

14. Распрацоўка праектаў зон аховы ажыццяўляецца праектнымі арганізацыямі, якія маюць у сваім складзе спецыялістаў, кваліфікацыя якіх пацверджана пасведчаннем на права выканання навукова-даследчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях.

15. Заказчыкам работ могуць выступаць адпаведныя службы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў або, па іх даручэнню, юрыдычныя, фізічныя асобы, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, зацікаўленыя ў правядзенні работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і на тэрыторыях, прылеглых да іх.

16. Распрацоўка праектаў зон аховы можа выконвацца толькі з дазволу Міністэрствам культуры, які выдаецца ў парадку, вызначаным заканадаўствам, пасля ўзгаднення задання на распрацоўку праекта зон аховы.

Заданне на распрацоўку праекта зон аховы складаецца распрацоўшчыкам сумесна з заказчыкам па форме згодна з дадаткам да дадзенай Інструкцыі і накіроўваецца на ўзгадненне ў Міністэрства культуры.

17. Калі апісанне граніц гісторыка-культурнай каштоўнасці адсутнічае або не вызначана ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, іх устанаўленне ажыццяўляецца на стадыі распрацоўкі праекта зон аховы на падставе праведзеных навукова-даследчых работ і ўносіцца ў праект зон аховы.

18. Пры разгрупаваным размяшчэнні гісторыка-культурных каштоўнасцей граніцы іх ахоўных зон могуць быць аб´яднаны.

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

19. Друкаванне і афармленне тлумачальнай запіскі праектаў зон аховы павінна ажыццяўляцца на аркушах фармату А4 (210x297) з наступнымі параметрамі настройкі ў рэдактары Microsoft Word:

палі старонак: верхняе і ніжняе – 20 мм, левае – 30 мм, правае – 10 мм;

шрыфт Times New Roman Cyr, звычайны, памер 15 пт;

міжрадковы інтэрвал – адзінарны;

першы радок у абзацы з адступленнем 1,25 см;

выраўноўванне па шырыні і, як правіла, без пераносу слоў;

нумары старонак у цэнтры верхняга калантытула з адлегласцю 1,0-1,5 см ад верхняга краю, памер шрыфта 14 пт (першая старонка не нумаруецца).

## ГЛАВА 4
## СКЛАД ПРАЕКТАЎ ЗОН АХОВЫ

20. Праект зон аховы павінен змяшчаць наступныя раздзелы:

папярэднія работы;

навукова-даследчыя работы;

апісанне граніц і рэжымаў утрымання і выкарыстання зон аховы;

графічныя матэрыялы ў адпаведнасці з падпунктам 22.3. пункта 22 і пунктам 23 гэтай главы.

21. Раздзел праекта зон аховы «Папярэднія работы» рыхтуецца з мэтай азнаямлення з гісторыка-культурнай каштоўнасцю і прылеглай да яе тэрыторыі. У ходзе падрыхтоўкі раздзела праекта зон аховы «Папярэднія работы» ажыццяўляецца:

азнаямленне з дакументацыяй, прадстаўленай заказчыкам;

азнаямленне з праектнай дакументацыяй у арганізацыях горадабудаўнічага профілю, складанне іх пералікаў і зняцце копій;

папярэдняе натурнае азнаямленне з гісторыка-культурнай каштоўнасцю;

вызначэнне тэрыторыі для даследавання, зверка геападасновы з натурай;

папярэдняе вывучэнне літаратурных і графічных крыніц.

У раздзел «Папярэднія работы» уключаюцца наступныя матэрыялы:

заданне на распрацоўку праекта зон аховы, узгодненае Міністэрствам культуры;

апісанне гісторыка-культурнай каштоўнасці і прылеглай да яе тэрыторыі;

акт вызначэння катэгорыі складанасці, падпісаны выканаўцам і заказчыкам.

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

22. Раздзел праекта зон аховы «Навукова-даследчыя работы» рыхтуецца з мэтай падрыхтоўкі навуковага і метадычнага абгрунтавання зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці, якія ўстанаўліваюцца.

Раздзел праектнай дакументацыі «Навукова-даследчыя работы» уключае выкананне наступных работ: гісторыка-архіўныя, бібліяграфічныя і натурныя даследаванні.

22.1. Гісторыка-архіўныя і бібліяграфічныя даследаванні – гэта вывучэнне пісьмовых, літаратурных, архіўных крыніц.

Па выніках праведзеных гісторыка-архіўных і бібліяграфічных даследаванняў складаецца гістарычная даведка, якая павінна змяшчаць наступныя матэрыялы, што ўключаюцца ў тлумачальную запіску:

выпіскі з архіўных і бібліяграфічных крыніц, якія прадстаўляюць пералік гістарычных звестак аб гісторыка-культурнай каштоўнасці;

копіі гістарычных планаў і (або) карт ці іх фрагментаў, пачынаючы з найбольш ранніх, з адлюстраваннем тэрыторый, на якіх размешчаны гісторыка-культурныя каштоўнасці;

гістарычныя натурныя фотаздымкі ці малюнкі асобных будынкаў, збудаванняў, іх комплексаў або ансамбляў, горадабудаўнічых панарам, іншых неабходных для падрыхтоўкі праекта зон аховы адлюстраванняў тэрыторый, якія закранаюцца гэтым праектам;

спіс бібліяграфічных, музейных, архіўных і іншых крыніц, якія ўтрымліваюць звесткі аб гісторыка-культурнай каштоўнасці.

22.2. Натурныя даследаванні – гэта візуальнае вывучэнне характару размяшчэння і ўспрымання гісторыка-культурнай каштоўнасці ў натуральных умовах. У ходзе натурных даследаванняў праводзяць:

вывучэнне архітэктурных асаблівасцей гісторыка-культурнай каштоўнасці;

даследаванне планіровачнай і прасторавай структуры тэрыторыі, дзе размешчана гісторыка-культурная каштоўнасць, і асаблівасцей яе гістарычнага фарміравання; сістэмы вуліц, плошчаў, дарог, заселеных і незаселеных, занятых раслiннасцю і адкрытых тэрыторый  і іх прасторавай арганізацыі, зрокавых сувязей паміж архітэктурнымі комплексамі, сувязі іх з прыродным акружэннем; аналіз ландшафта і своеасаблівасцей абрысу населенага пункту;

даследаванне забудовы населенага пункта – мастацка-гістарычнай каштоўнасці складаючых яго будынкаў і збудаванняў, вызначэнне горадафарміруючага значэння гісторыка-культурных каштоўнасцей, выяўленне аб´ектаў, якія патрабуюць захавання і надання ім статусу гісторыка-культурных каштоўнасцей, а таксама аб´ектаў, што парушаюць архітэктурнае адзінства горадабудаўнічага комплекса або перашкаджаюць візуальнаму ўспрыманню гісторыка-культурных каштоўнасцей або ландшафту;

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

фотафіксацыю гісторыка-культурнай каштоўнасці ў існуючай сістэме планіровачнай структуры з вызначэннем найбольш значных відавых кропак;

ландшафтны аналіз тэрыторыі – адлюстраванне асаблівасцей прыроднага ландшафту і візуальнага ўспрымання прыродных і архітэктурных дамінант, выяўленне каштоўных і дысаніруючых элементаў;

вызначэнне межаў распаўсюджвання культурнага пласта і яго магутнасці на тэрыторыі праектавання на падставе апублікаваных звестак;

апісанне прынцыпаў ацэнкі забудовы, яе тыпалогіі, парадак аднясення тых ці іншых аб´ектаў да дысгарманічных, тлумачэнне прынятых умоўных адзнак, пералік гісторыка-культурных каштоўнасцей, рэкамендацыі па правядзенню неабходных мерапрыемстваў, звязаных з выкарыстаннем нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей, іх асяроддзя, а таксама па ліквідацыі парушэнняў, якія прычыняюць шкоду гісторыка-культурным каштоўнасцям і іх асяроддзю.

22.3. Па выніках праведзеных натурных даследаванняў у праект зон аховы уключаюцца наступныя чарцяжы:

«гісторыка-архітэктурны апорны план» (маштаб 1:5000 – 1:2000; 1:500), на якім павінны быць нанесены ўсе нерухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці, іншыя будынкі і збудаванні, аб´екты, што фарміруюць асяроддзе, у тым ліку сістэмы і элементы планіроўкі, сувязі, якія маюць гістарычную і горадафарміруючую значнасць, традыцыйныя месцы зрокавага ўспрымання гісторыка-культурнай каштоўнасці і панарамы забудовы, якая ўключае гісторыка-культурную каштоўнасць;

«схема ландшафтнага аналізу» (маштаб 1:5000 – 1:2000; 1:500), якая выяўляе існуючыя найбольш значныя элементы і сістэмы ландшафта, існуючыя і (або) страчаныя відавыя сувязі, зону найлепшага візуальнага ўспрымання гісторыка-культурных каштоўнасцей, якая вызначаецца на адлегласці ад 250 да 350 метраў ад гісторыка-культурнай каштоўнасці, у залежнасці ад якасці бачнасці ўсіх яе дэталей. Канфігурацыя зоны вызначаецца ў асноўным эмпірычна на месцы і залежыць ад характару рэльефа, планіроўкі, характару навакольнай забудовы і раслінnасці. Басейн бачнасці гісторыка-культурных каштоўнасцей і дамінант вызначаецца агульным характарам рэльефа, размяшчэннем гісторыка-культурных каштоўнасцей, дамінант і іх вышынёй. Мяжа басейна бачнасці можа быць вызначана толькі на мясцовасці і пацверджана фотафіксацыяй;

графічныя матэрыялы, панарамы, перспектывы, разгорткі, фота з натуры, якія характаразуюць працэс развіцця і сучасны стан гісторыка-культурнай каштоўнасці, асяроддзя і тэрыторыі, прылеглай да каштоўнасці.

На чарцяжах паказваецца пералік умоўных пазначэнняў, неабходных для графічнага складання гісторыка-архітэктурнага апорнага плана:

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

гісторыка-культурныя каштоўнасці, уключаныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь;

каштоўнае гісторыка-архітэктурнае асяроддзе;

шэраговае гісторыка-архітэктурнае асяроддзе;

нейтральная забудова;

дысаніруючая забудова;

археалагічныя аб´екты і (або) тэрыторыі з наяўным культурным пластам;

чырвоныя лініі кварталаў гістарычна каштоўнай планіровачнай структуры;

напрамкі вуліц, якія захаваліся з мінулага;

межы домаўладанняў;

зялёныя пасадкі, якія захаваліся з мінулага;

мяжа тэрыторыі гістарычнай часткі населенага пункта;

кропкі візуальных панарамных раскрыццяў;

тэрыторыі кварталаў забудовы;

прамыслова-складскія тэрыторыі;

крутыя схілы тэрас і рвоў;

зялёныя пасадкі агульнага карыстання;

пабудова схем гістарычных этапаў змянення праектіровачнай і аб'ёмна-прасторавай структуры развіцця і інш.

23. У раздзеле праекта зон аховы «Граніцы, рэжымы ўтрымання і выкарыстання зон аховы» даецца апісанне граніц гісторыка-культурнай каштоўнасці, зон аховы, іх рэжымаў утрымання і выкарыстання з абгрунтаваннем прынятых у праекце рашэнняў, падрабязным апісаннем прывязак граніц зон аховы да антрапагенных і (або) прыродных аб'ектаў, удакладненнем рэжыма выкарыстання і ўтрымання тэрыторый зон аховы ў адпаведнасці з канкрэтнымі ўмовамі кожнай зоны або розных іх участкаў.

Чарцёж «Граніцы зон аховы» рыхтуецца нанясеннем на план населенага пункта, на якім паказана планіроўка тэрыторыі, прылеглай да гісторыка-культурнай каштоўнасці ў маштабе 1:5000 – 1:500. На чарцяжы «Граніцы зон аховы» наносяцца таксама і граніцы гісторыка-культурнай каштоўнасці.

## ГЛАВА 5
## ЗАЦВЯРДЖЭННЕ ПРАЕКТАЎ ЗОН АХОВЫ

24. Праекты зон аховы зацвярджаюцца пастановай Міністэрства культуры.

25. Для зацвярджэння праекта зон аховы заказчыкам (або па яго даручэнню праектыроўшчыкам) ў Міністэрства культуры накіроўваюцца:

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

пісьмо-заява аб зацвярджэнні праекта зон аховы ў вольнай форме;

1 камплект праекта зон аховы ў складзе, які вызначаны главой 4 дадзенай Інструкцыі (для разгляду і перадачы ў Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне);

раздзел праекта "Граніцы і рэжымы ўтрымання зон аховы" (тэкставыя і графічныя матэрыялы) у 2 экземплярах і на электронным носьбіце (для афармлення дадатку да пастановы Міністэрства культуры, для яго зацвярджэння);

копія папярэдняга ўзгаднення масцовым выканаўчым і распарадчым органам, на тэрыторыі якога размешчана гісторыка-культурная каштоўнасць.

26. Зацвярджэнне праектаў зон аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей катэгорыі "0", "1", "2" ажыццяўляецца на падставе станоўчага заключэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь (далей - Навукова-метадычная рада).

Неадобраны Навукова-метадычнай радай праект зон аховы не падлягае зацвярджэнню і павінен быць дапрацаваны з улікам заўваг.

27. Падрыхтоўка і прыняцце пастановы Міністэрства культуры ажыцяўляецца ў 30-дзённы тэрмін з дня падачы пісьма-заявы пры ўмове выканання патрабаванняў, вызначаных дадзенай Інструкцыяй, або рашэння Навукова-метадычнай рады.

28. У выпадку немагчымасці падрыхтоўкі пастановы аб зацвярджэнні праекта зон аховы Міністэрствам культуры рыхтуецца заключэнне па навукова-праектнай дакументацыі ўстаноўленай формы з указаннем прычын адмовы ў зацвярджэнні праекта зон аховы.

29. Копіі пастановы Міністэрства культуры аб зацвярджэнні праекта зон аховы накіроўваюцца заказчыку работ і ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган, на тэрыторыі якога размешчана гісторыка-культурная каштоўнасць.

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Дадатак
да Інструкцыі аб складзе, парадку распрацоўкі і зацвярджэння праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей

ФОРМА

УЗГОДНЕНА
Начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

_______________ _____________
*подпіс* *Ініцыялы, прозвішча,*

«___»____________200__г.
М.П.

ЗАДАННЕ НА РАСПРАЦОЎКУ ПРАЕКТА ЗОН АХОВЫ

Згодна з артыкулам 29 Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., № 9, 2/1195) распрацаваць праект зон аховы для

гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “____” ________________________________
*назва згодна з Дзяржаўным спісам гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь і дата стварэння*

размешчанай ________________________________
*месцазнаходжанне*

Заказчык ________________________________
*юрыдычная назва*

Падстава для распрацоўкі праекта зон аховы — пісьмо-заказ ад __________ №_____,

дазвол Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на выкананне работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях — ад ________ № __________

Праектная арганізацыя ________________________________
*юрыдычная назва*

Тэрмін і чарговасць праектавання ________________________________
*тэрмін выканання работ, від работ*

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Асобыя ўмовы - вызначэнне граніц і рэжымаў утрымання і выкарыстання зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Іншыя ўмовы і патрабаванні па распрацоўцы праекта зон аховы ________________________________________________________________.

Заказчык:

| ____________________ | ____________________ | ____________________ |
|---|---|---|
| *пасада* | *подпіс* | *Ініцыялы, прозвішча* |

М.П.

Праектная арганізацыя

| ____________________ | ____________________ | ____________________ |
|---|---|---|
| *пасада* | *подпіс* | *Ініцыялы, прозвішча* |

UNESCO Cultural Heritage Laws Database
(Copyright and Disclaimer apply)